# „ЖАДАЮ ПОСПЕХАЎ У ВУЧОБЕ“

## (Пісьмо тав. ЧАРВЯКОВА)

Дзяржынскія піонеры выступілі перад райкомам комсамола прапанову арганізаваць гутарку лепшых піонераў і школьнікаў раёна з старшынёй ЦВК СССР і БССР тав. Чарвяковым. Райком комсамола паслаў тав. Чарвякову аб гэтым пісьмо. Тав. Чарвякоў паслаў райкому такі адказ:

«ДАРАГІЯ ТАВАРЫШЫ!

ВАША ПІСЬМО, У ЯКІМ ВЫ ПРОСІЦЕ, КАБ Я ПРЫНЯЎ ДЭЛЕГАЦЫЮ ПІОНЕРАЎ І ШКОЛЬНІКАЎ, ЛЕПШЫХ УДАРНІКАЎ ВАШАГА РАЁНА, Я АТРЫМАЎ.

Я ЗРАБЛЮ ГЭТА З ВЯЛІКАЙ РАДАСЦЮ, БО ВЕЛЬМІ ЛЮБЛЮ НАШЫХ СЛАЎНЫХ РЭБЯТ СОВЕЦКАГА САЮЗА І РАДУЮСЯ ІХ ПОСПЕХАМ.

АЛЕ ЦЯПЕР, ВАМ, ШКОЛЬНІКАМ, ТРЭБА ПАДЦЯГНУЦЦА ДЛЯ ТАГО, КАБ ПАСПЯХОВА ЗАКОНЧЫЦЬ НАВУЧАЛЬНЫ ГОД, А Я БУДУ ЗАНЯТЫ ЦЭЛЫМ РАДАМ СУР'ЁЗНЫХ СПРАЎ.

ТАМУ Я ПРАПАНУЮ, КАБ ВЫ АРГАНІЗАВАЛІ ТАКУЮ СУСТРЭЧУ ПА СКАНЧЭННЮ НАВУЧАЛЬНАГА ГОДА З ТЫМ, КАБ УКЛЮЧЫЦЬ У ДЭЛЕГАЦЫЮ ЛЕПШЫХ УДАРНІКАЎ ВУЧОБЫ І КАБ КОЖНЫ ДЭЛЕГАТ МОГ РАСКАЗАЦЬ АБ ВЫНІКАХ ГАДАВОЙ РАБОТЫ Ў ШКОЛЕ, АБ СВАІМ УДЗЕЛЕ Ў БАРАЦЬБЕ ЗА ЎРАДЖАЙ, ЗА ВЫРОШЧВАННЕ МАЛАДНЯКА, ЗА САЦЫЯЛІСТЫЧНУЮ КУЛЬТУРУ. ДУМАЮ, ШТО ВЫ З ГЭТЫМ ЗГОДЗІЦЕСЯ.

ЖАДАЮ ЎСІМ ПІОНЕРАМ І ШКОЛЬНІКАМ ПОСПЕХАЎ У ВУЧОБЕ. У АЎЛАДАННІ ВЕДАМІ ДЛЯ ТАГО, КАБ ВЫХАВАЦЬ З СЯБЕ ЗАГАРТАВАНЫХ ЛЕНІНЦАЎ-СТАЛІНЦАЎ, ГАТОВЫХ ДА АХОВЫ ГРАНІЦ НАШАЙ ВЯЛІКАЙ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ РАДЗІМЫ.

З ТАВАРЫСКІМ ПРЫВІТАННЕМ

А. ЧАРВЯКОЎ.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ